БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя — зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць пер сыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб на апошняй — 50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 25. Менск. Панядзелак 22 красавіка 1918 г. Год I

Два ворагі.

Спакойнаму, любячаму згоду і лад нашаму народу спрадвеку прыходзіцца ваяваць. як цяпер кажуць, на два фронты. З заходу—палякі, з усходу—маскалі. Два хцівых, нінасытных суседы выцягуюць са сваіх гнездау гострые капцюры каб адарваць кавалак зямелькі нашай, або узяць у няволю часьціну народу нашаго. Вечны стогн. вечная барацьба стаяць на абшарах беларускіх, багатыя патокі крыві здобруюць нівы нашые. А калі сьціхаюць гарматы, калі чэзьнэ рабунак «сярод белаго дня», тады вылазяць ізноу жа с тых самых варшаускіх аб маскоускіх гнездау усякія ціхія «працаунікі». Беларус спакойна сьпіць, а гэтыя старэнныя людзі шафуюць яго меннем. «Дзеннік Менскі» у № 62 перაказуе вывады новай нацыянальнай статыстыкі нашае стараны, якую дае нейкі пан Сьвеховскі. Гэты пан, бачыце, пасьля «мазольнай» працы дау такое вось „сьціслае» дапауненьне усіх іных польскіх статыстычных працау. На абшарах Вялікай Літвы (губ. Віленская, Ковенская. Менская, Гродзенская, Магілеуская і Віцебская) жыве ні больш і ні менш, — а *тры міліоны* з лішкаю палякоу. Есьць там. кажа, прауда і іншые народы. Між іншымі успомніу і беларусау. Іх, бачыце, на іхнай бацькаушчыні жыве—так сама тры міліоны. Але гэта толькі на лік. Значэнне і вага іхнія відаць іншчэ меньшыя, бо—яны ні маюць зямлі. Палавіна усей зямлі належыць палякам, а другая палавіна усім іным—літоуцам, беларусам, украінцам і каму хочацс. Сколькі зямлі належыць кожнаму асобнаму народу, «Дз. Мен.» ні напісау, але пэуне-ж, беларусы, якіе *нідзе* ні у адным павеці ні маюць больш за 68% агульнаго ліку паселення, пэуне яны у сваім родным краі валадаюць толькі якою трацінаю або чэцьвярцінаю зямлі.

Каб паказаць увесь фалш, якім займаюцца польскія статыстыкі мусім прывесьці праудзівую цыфру палякау. У 5-х губэрнях успомяненых выжэй асобау гаворачых на польску было у 1897 годзе—563.854 чалавек. За гэтые 20 гадоу лік іх ні мо подняцца выжэй за 800.000", бо пакуль штэ дзякаваць Богу, да нас іншчэ польскія перасяленцы ні наехалі. Аткуль жа узяу свае цыфры пан Сьвеховскі?—А ен проста палічыу *усіх каталікоу беларусоу палякамі!*

Ведама, два с паловаю міліоны людзей—гэто кавалак ні кепскі. І так сама мы ведаім, што польскія шовіністы ужо дауно прывыклі лічыць іх сваймі. Вось напрыклад гэтымі днямі даводзілося мне бачыць беднаго уцекача родам з Беласточчыны, а жыушаго у Городні, якому Цэнтральны Комітэт Обыватэльскі выдау пасьвядчэнне, што ен есьць жыхаром „Каралеуства Польскаго». Гэтак Ц. К. О. далучыу ужо старое беларускае места Горадню і важнейшы беларускі прамысловы цэнтр Беласток да Польшчы.

Пан Сьвеховскі кончыушы навуковыя выклады дасць і палітычное рэзюмэ — «мы, кажа, ні хочам тут (на Беларусі і Літве) ні панаваць, ні урадзваць». Дзякуй, пане Заглоба, ці-то пане Сьвеховскі. «Мы» беларусы так сама ні хочам у вашым Каралеустве ані панаваць, ані—камандаваць вамі. Жывіце сабе, як уважаіце для вас ляпей. Ні варта было б больш гаварыць аб гэтым новым утвору польскай навукі. Але трэба застанавіцца на адпэй вельмі характэрнай рысе. Аказуецца што пан Сьвеховскі зрабіу толькі лоукую маніпуляцыю з тымі данными якія зьбірау у сваіх палітычных мэтах—расійскі міністар - вешацель—Столыпін Во, гэта дык ужо саусім пекна. Мы былі ужо і забыліся, як на з'ездзі у Празе—Чэскай пан Дмоускі с панамі расійскімі нацыяналістамі падзялілі згодне беларусоу: —каталікоу—палякам, а праваслауных—маскалям. А цяпер мы гэта прыпамінаем. Палякі ні здарма маюць такую пашану да Сталыпіна—гэта аднаго поля ягады. Адзень Дмоускаму паддзеуку і «косаваротку»—цудоуны маскаль выйдзе. А Столыпін, кажуць, вельмі ласкавы быу да сваіх суседзяу палякоу—у Ковеншчыне. Гэтак, - адвечныя ворагі пагадзіліся на разьдзелі багатай здабычы.

«Мазольная» праца пана Сьвеховскаго паказвае, што пара того «славяпафільства», якое пабудована было на разьдзелі Беларусі палякаɪɪ і маскалямі іншчэ ні мінула. Сталыпінскі прынцып: хто католік той паляк, а праваслауны—маскаль цяпер асабліва падабаецца палякам. Будзем спадзевацца што ні дасьць Бог «некаму» рог.

Сталыпінскую працу вядуць цяпер у нас на Беларусі—маскоускія эс эры. Хаваючыся пад скурку прыяцеляу народу, абецаючы, зямлю і волю (так сама пан Заглоба), яны проста яуляюцца агентамі расійскагоураду, вядучымі закулісную палітыку проці беларускай нізалежнасьці. І у той час, як правамоцные прэдстаунікі беларускаго народу прызналі, што у нізалежнасьці Беларусі—адно яе збавенне, адзін спосаб, каб захаваць яе цэльнасьць, каб забязпэчыць ей лепшую будучыну, паны *насьледнікі* Сталыпіна баламуцяць селян беларускіх, штэ зьехаліся на земскі збор, нагаваруюць іх проці нізалежнасьці Беларусі, проці усяе беларускае справы. Мы вельмі паважаем ідэю земства і асабліва земства дэмократычнаго але тая нігодная работа, якая вядзецца пад яго шыльтам маскоускімі прыблудамі прымушае нас да энэргічнаго пратэсту. Так далей быць ні можа. Годзі зьдзекаваліся і ашуківалі беларускаго селяніна маскоускія найміты!

Два с палавінаю міліоны беларусау адлічаюць сабе палякі. А рэшту беларусау пэуне-ж захочуць узяць сабе на апеку удзячныя маскоуцы. Мы ні ведаім, ці была умова паміж маскоускімі эс-эрамі і польскімі нарадоуцамі ці не, але яны працуюць у адным кірунку. І тым і гэтым нізалежнасьць Беларусі вельмі ні падабаецца і яны усімі сіламі стараюцца яе падкапаць.

Палякі тут дужэйшые—і дзеля таго іхнія нацыяналісты ідуць проста. А маскалі—крадуцца зза вугла, ашукуюць селян, карыстаючыся з іхнай нісьвядомасьці.

Тым і іншым беларус мусіць абвесьціць нішчадную барацьбу. У гэты вялікі гісторычны час, калі ізноу с пад пылу вякоу паустае беларуская дзержаунасьць, нам трэба прыпомніць запаветы дзядоу нашых, якія увесь час, пакуль жыла Беларусь, роуна біліся і с паляком і з мааскалем.

За вольную волю, за суцэльнасьць Белае Русі.

Л. Б.

„Беларускі конгрэс".

(матэрыялы і дакумэнты).

Разгонам была запынена праца і анкетнай камісіі, якая павінна была даць статыстычныя данныя аб першым ўсебеларускім з'езде 5—15 сьнежня 1917 году. Частка анкетных лістоў асталася нізапоўненай, частка была знішчана большэвікамі разам счасьцю дакумэнтаў мандатнай камісіі пры разгоне Вайсковай Рады. Асноўваючыся на тых астатках дакумэнтаў якія удалося выратаваць, п. Н. Крэчэўскі папрабаваў нарысаваць облік з'езду у артыкуле «Составъ 1-го Всебѣлорусскаго съѣзда» надрукаваным у № 1 газэты „Бѣлорусская Рада «(Органъ Исп. Ком. Цент. Войск. Рады)» за 1918 год. Але гэты нумэр газэты ні убачыў сьвету, бо адміністрацыя і наборшчыкі друкарні інвалідаў спалілі газэту. Такім чынам статыстыка з'езду зноў асталася нівядамай шырэйшаму грамадзянству. Падамо тутака данныя якія ў сваім артыкуле зьмясьціў п. Н. Крэчэўскі.

Ад 5 да 17 сьнежня мандатная камісія выдала 1167 мандатаў с правам пастаноўляючаго голасу і 705 с правам дарадчаго. Цывільным асобам было выдано 812 мандатаў с правам пастанаўляючаго голасу і 344 с правам дарадчаго. Ваенным—с правам пастн. голасу 355 і правам дарадчаго 361. *).

Дэлегатам ад валасьцеў земстваў, гарадоў і інш належало каля 445 мейсцаў с правам пастанаўляючаго голасу. Соцыялістычныя партыі, профэсыянальныя зьвязкі, палітычныя і іншыя арганізацыі былі прэдстаулены 367 дэлегатамі с правам пастанаўляючаго голасу.

Анкэтных лісьцікаў захавалася 357. Данныя у іх такія:

Партыйнасьць: анархістаў 1, максімалістаў 1, ідэйовых большэвікоў 2, большэвікоў 31, левых с.-р. 57, Беларускай соц. грамады 33, с.-д. інтэрнацыяналістаў 2, соц. дэмакратаў 7, соц.—рэвал. 73, трудовікоў 4, парт. „Единство» 1, Белар. дэм. партыі 1, Белар. парт. соц. народн. 6, «Наша Ніва» 1, к.-д. левых 1, ніпартыйных 79, спагадаючых с.-р. і большэвікам 57.

Адукацыя: малаграматных 17, самавукаў 5, зашкольн. адук. 27, народнай школы 195, рамесьніцкіх школоў 3, сельска-гасп. школаў 3, землеробск. школ. 2, «Гарадзкіх» школ. 18, Настаўніцкіх сэмін. 31, Царкоўнанастаун. школ. 4, Настаўніцкі інстыт. 6,6 кляс рэальнай школы і гімназіі 2, сярэдніх школ. 14, духоўн. школ. 1, духоун. сэмін. 1, ваенн. школ. 2, ваеп.—інж. школау і 2 кл. ваенн. акад. 1, музыкальн. школ. 1, экстэрн. 1, унівэрсыт. і спэц. выжш. 25.

Соцыяльны стан: селян 101, салд. і матр. 149, работнікаў 16, настаўнікаў 38, быўш. ахвіцэр. і генэрал. 12, бежанцаў селян 29, гандляр 1, інтэлігентн. працоўн. 29.

Век: 19—20 гад. 11, ад 20 да 25 гад. 86, ад 25—30 гад. 106, ад 30—40 гад. 123, ад 40—50 гад. 27, 51 год 1, 52 гады 1, 57 гад. 1, 62 гад. 1.

---

*) Вялікая лічба мандатоу с правам дарадчаго голасу тлумачыцца тым, што усялякія арганізацыі пераважна селянскія, па нідасьвядчэнню выдавалі сваім дэлегатам ні аднаведныя форме дакумэнты.

РАСПАРАДЖЭННЕ.

аб сэквэстру і купоўлі харчовых прадуктаў Упраўленнем места Менску.

§ 1.

Ад 22 красавіка 1918 г… гарацкім Управленнем будуць сэквэстров… гэткія прадукты:

Збожо (жыто, пшано, ячмень, грэчка, мешанае збожо і маіс). **Мука** (усякіх гатункау і мешаная). **Крупы, каша і грачуха. Выробы з мукі** (упакованыя і без упакоукі). **Хлеб, булкі,** песта с пшэннай мукі, апрача цесткау, тортау і кандзітарскіх выробау. **Стручковыя.** (Фасоля, гарох, чачавіца, просо, рыж, саго). **Картофля. буракі і іншыя корнеплоды. Варыво сушонае і квашанае** (выключаючы агуркі). **Цукер** (галовачны, кавалкавы, пясок, цукровы сіроп). **Соль** (кухонная і для быдла).

Подлуг сэквэстрацыі ніхто ні мае права купоулі і продажы памянёных харчовых прадуктау, Гэта датычэ экспэдытарскіх і камісьонных складоу і заложаных таварау. Хлеб у колькасьці 2 расійскіх фунтау на аднаго чаловека дозваляецца прадаваць і далей (гл. § 3). Забарона прадажы ні датыча меськіх крамоу, хаурусных складау а також бежанскіх і доброчынных камітэтау.

§ 2.

Ні падлегаюць сэквэстру:

Колькосьць прадуктау азначаных пры каждым нумэру назначаецца для аднэй сям'і.

1) **Мука** усякіх гатункау і мешаная	до	20 руск	фун.
2) Крупы. каша, грачуха. проса	»	5	»
з) Выробы з мукі (упаков. і без упак.)	»	2	»
4) Стручковыя (фасоля, гарох, чачавіца, рыж, сага)	»	2	»
5) Цукер (галовачны, кавалк. пяс. цукер. сыроп)	»	5	»
6) Варыво:			
а) сушонае	»	2	»
в) квашаное	»	20	»
с) консэрвованае у банках	»	5 штук.	

§ 3.

Лішкі прадуктау, перевышаючыя паказаную норму павінны быць сданымі для вольнай прадажы у сьледуючые мейсцы:

Паліцэйская I часьць: ад 23 да 27 красавіка.
а) склад № 7, Петрапаулауская.
в) меськую краму № 4. Захарэуская 46.

Паліцэйская II часьць ад 24 да 28 красавіка.
а) склад № 4, Юрэуская № 15.
в) меськую краму № 3. Рог Петрапаулаускай і Хрынчэнскай.

Паліцэйская III часьць ад 25 да 29 красавіка.
а) харчовы аддзел Менскай Управы Захароуская 97.
в) краму Леукова. Захароуская.

Паліцэйская IV часьць ад 26 да 30 красавіка.
а) склад №3. Серпухоуская 5.
в) склад № 1. Захароуская 47.

Паліцэйская V часьць ад 27 красавікада 1 маю.
а) склад № 13
в) склад № 14 } Нова-Маскоуская 36

Ні падлегаюць здачы але павінны быць заяулены харчовай Камісіі такія прадукты: Хлеб, картофля, буракі і іншыя корнеплоды і збожо у колькасьці да 20 фунтау.

§ 4.

Звальняюцца ад абавязковай аддачы усякіх харчовых прадуктау: Меськая Рада, Меськія крамы, Хаурысы (коопэратывы), хаурысныя ж. д. крамы, больніцы, прытулкі, ахраны, народныя кухні, бежэнскія камітэты, школы. даброчынныя установы.

§ 5.

Усе найменованыя у § 4 інстытуцыі, выключаючы жал. дар. хаурусу, павінны да дня 26 красавіка прэдставіць у магістрат сьпіскі праудзівай колькасьці і гатунковасьці харчовых прадуктау.

§ 6.

Усякіх катэгорыяу устэрыі, … шйіцы, гарбатні, рэстараны, прыватныя сталовыя і падобныя другія зак… ды павінны 26 і 27 красавіка здаць свае харчовыя запасы у склад Захароуская 47. Уласьнікау гэтых закладау ні датычэ распараджэнне аб здачы прадуктау па паліцейскім часьцям.

§ 7.

Учаее ад 22 красавіка да 1 мая усякія харчовыя прадукты (гл § 2) прывезеныя у горад купцамі і прыватнымі асобамі павінны быць прэдстаулены для пакупкі у бліжэйшы меські харчовы склад. На гэтыя прадукты цэны установлены будуць асобна, а ні тыя, што у § 10. Купоуля гэтых прадуктау у Менску забаранонена.

§ 8.

Пасьля 1 мая 1918 году прадукты найменованыя у § 1 (за выключэннем запасоу пазвол. у § 2) павінны належаць да места Менску. **Памешкання і крамы будуць кантраліравацца.**

§ 9.

Устэрыям, цукерням і г: іншым (гл. § 6) будзе пакінута колькасьць сэквэстрованых прадуктоу, прыбліжачы, патрэбная на адзін тыдзень Апрача гэтаго уласьнікі могуць мець для спажытку свае сям'і колькасьць прадуктау паказаную у § 2.

§ 10.

Пры вольнай прадажы устанауляюцца гэткія цэны:

На збожо: жыто, пшаніца, ячмень, мешаное збожо, маіс,	па 60 кап. за 1 фунт.	
» муку рожных гатункау і мешаную	» 60	» » » »
» кашу, грачуху	» 75	» » » »
» мучныя выробы (упакованыя і бэз упакоукі	» 120	» » » »
» стручковыя: фасоля, гарох, чэчавіца, просо, рыж, саго	» 75	» » » »
Варыво:		
а) сушонае	« 50	» » » »
в) квашонае	« 30	» » » »
с) консэрваван. у банках	« 100 брутто.	
Цукер	« 120 за 1 фунт.	

§ 11.

3 дня апублікования гэтаго распараджання усякі вываз найменаваных прадуктау з м. Менску забараняецца.

§ 12.

Купоуля гэтых прадуктау у далейшым часе пазваляецца толькі на картачкі (Бежэнскія камітэты могуць выдаваць своім членам прадукты і без карточок).

§ 13.

Ніспоуненне карацімуцца штрафам да 20.000 марак,—апрача грашовай кары можа быць наложана кара пазбауленнем свабоды да 5 гадоу.

§ 14.

Каждая сем'я, павінна да 20 красавіка забэзпечыць сябе з харчоваго Комітэту, Юрэуская 3, харчовымі картачкамі.

Менск 17 красавіка 1918 году.

Камэндант
фон-ФРАНКЕНБЕРГ.
Палкоунік.

Цікава, што большэвізм прыпадае глаўным чынам на век ад 19 да 25 гадоў. За гэтым векам большэвізм трапляецца рэдка.

Што датыча рубрык аб социяльным стане і партыйнасьці, то тутака дадамо увагу, што данныя анкеты, гэтаго боку ні могуць лічыцца саусім праўдзівымі. Саслоўныя і прыпадковыя найменя: «селянін», «бежанец», «ахвіцэр», «салдат» былі бардзей толькі пашпартам адпаведаўшым агульнарасійскаму запатрабаванню на «дэмократычнасьць, а ні азнакай соцыяльнаго, стану, што з«левізной»--быўтакі час, ні «левых і за людзей ні лічылі».

Н—і.

(Ца чародн. №)

На беларускім шляху

На апошнім сваім заседанні Рада Беларускай Народнай Рэспублікі прыняла 14-го красавіка пастанову паслаць дэлегацыю з двух чалавек да Гэрманскай Окупацыйнай Улады выясьніць: 1) аб массовым затрыманні Гэрманскай Уладай тутэйшых жыхароў Беларусі і аб мажэбнасьці асваб джэння іх; 2) аб установленні пры Народным Сэкратарыяці рэгістрацыі жыхароў Беларусі.

Выбраныя Радай дэлегаты, члены яе юрыст Л. Заяц і д-р Б. Айзэнштат 15 красавіка былі прыняты Палкоўнікам Фон-Келлярам і выясьнілі вось што:

Дзеля ні спаўнення урадам Вялікаросіі варункаў міру (заместа пэўнай дэмабілізацыі—фармаванне новай чырвонай гвардзіі, вайны с Украінай, помач супроціў Гэрманскіх войск у Фінляндзіі і т. п.), Гэрманская улада, разумеецца, мае право лічыць быўшых ваенна-служачых — ваеннапалоннымі. Пасьля першаго распараджэння аб затрыманні нізарэгістраваўшыхся, выйшло другое—а затрыманні ўсіх наагул салдатаў. Пры гэтым пападаліся і цывільныя, затрыманне каторых ні было мэтай акупіраваўшай улады.

Апрача таго, паміж затрыманых салдатаў, як аказалося, была шмат сямейных, пакінуўшых свае сямейства ў Менску без ніякай помачы, а так сама і тутэйшыя жыхары горада і яго аколіц, маючых сталую працу. Зважаючы на гэта, Гэрманская улада ужо занялася акуратным пярэглядам дакумэнтаў усіх затрыманных асоб і —па магчымасьці—выжэй выказаныя будуць звольнены. Іх ні атправілі у Гэрманію, а знаходзяцца яны крыху на заход Менскаго району. У будучыні ні толькі цывільныя жыхары, але і быўшыя ваенна-служачыя, прэдставіўшыя патрэбныя рэгістрацыйныя картачкі, затрымовываца ні будуць. Што да кабет, то распараджэння аб іх затрыманні ні было=гэта толькі подлая выдумка.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Біскуп каталіцкі Лазінскі паведаміу с Пецярбургу, што ен свайго назначэння у Менск ішчэ ні атрымау з Рыму, дык пакуль што яго мейсцэ часова будзе займаць тут кс. О'Рурк. Біскуп Лазінскі займе у Менску памешканне для сябе у шляхецкім доме.

Губэрнскае Земскае Сабранне ні удалося дзеля таго, што выбарныя ні былі пэуны у гэтым з'едзі: былі як вядома, чуткі, што з'езд ніадбудзецца, а павесткі, пацьвержаючыя дзень сабрання,—пасланы ні былі.

Цяпер з'езд Губэрнскаго Земства назначаны на 7 мая.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 21 красавіка 1918 року.

З А Х А Д: **Група Кронпрынца Рупрэхта і Нямецкаго Кронпрынца:**

На палёх бітвы ўзаемныя разьведкі прывелі да моцных пяхотных баёў. Рухавыя артылерыйскія бае каля Ля-Бассэ, Ленс і Альбэрт. Міжы Аўраю і Уазаю так сама рухавая работа артылерыі.

Група Гальвітца і гэрцога Альбрэхта.

Саксонскія батальёны капалі на пазыцыі амэрыканцаў міжы рэкамі Маас і Мозэль каля Сэйшпрэй. Яны атакавалі сяло і прабіліся на 2 км. ў глыбь за ніпрыяцельскія акопы. Слабыя контр-атакі ніпрыяцеля былі адкінуты.

У ночы нашы штурмавыя атрады вярнуліся, пасьля нападзення на ніпрыяцельскія лініі, назад на ісходнае палажэнне. Страты амэрыканцаў нізвычайна цяжкія: забрано у палон 183 амэрыканцы, сярод іх 5 афіцэраў, захоплено 25 кулямётаў. Поўночна-захадней Марвіля, на ўсход ад Понт-а-Муссон мы захапілі ў баю палонных французаў.

Ротмістр барон фон-Рыхтгофэн вадзіцельствуючы слаўным 11-м атрадам зьнішчыцеляў, здабыў сваю 79 і 80 перамогу ў паветры, лейтэнант Бюклэр—31-ю паветраную перамогу.

У С Х О Д: Скруціўшы ніпрыяцельскую праціўнасьць каля Перакопу і Карказату нашае войска пралажыло сабе дарогу да Крыму.

Македонскі фронт: шчырая дзейнасьць ніпрыяцеля захадней Дойранскаго возера і ў раўніне Струмно.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Затрымліванне салдат.

Нас паведамляюць з ваеннаго боку:

Прыказ яуляцца для рэгістрацыі на кантрольны пункт быу выпоунены ні усімі салдатамі расейскай арміі. Пасля частых прыпамінаннеу быу выданы прыказ затрымаць усіх расейскіх салдатау. Дзеля гэтаго былі затрыманы усе, адзетые у расейскую ваенную форму.

Паміж затрыманымі знайшлося шмат такіх асоб, якіе нізаконна насілі форму; дзеля таго яны самі віноунікі што іх арыштавалі.

Аднак ні гледзячы на тое, пасьля праверкі лічнасьці затрыманых, прыняты меры каб звольніць такія асобы, каторыя служаць у мінскіх упрауленьнях і арганізацыях обо яуляюцца карміцелямі вялікіх сямей, урэшці калі знойдуцца і другія важныя прычыны дзеля іх звальнення.

Два гадавыя агулькыя сходы—у 1-м пазычкова-ашчадным таварыстве і гарацкім узаемным страховым т-ве—маюць адбыцца ішчэ да Вялікадня. А пакуль што ідзе гарачая падгатоука: шмат каму хочацца праціснуцца на платныя мейсцы—у члены праулення, рэвізыйную камісыю і т. п.

Дауней да агітацыі памагалі кумауство і манаполькі; але манаполька цяпер цамерла, а кумауство нашы грамадзяне, будзім спадзевацца, перараслі і паважныя мейсцы займуць паважныя людзі.

Зямлялаусьнікі, с прычыны распараджэння нямецкай улады аб прымусовых засевах, асабліва мінскаго павету, дзе менш зруйнованы двары,—пачалі што раз больш вертацца на свае сядзібы і брацца за работу.

У міліцыю—пры кожным участку назначаны па 30 нямецкіх салдатау, каторыя будуць павераць у жыхароу запасы прадуктау.

У «Беларускай Хатцы» на Конным пляцу пры III часьці с панядзелку 22-го красавіка ад 4-ай гадз. дня атрываецца кінематограф.

Выдача бонавых кніжэк больш-менш, ял відаць, зацягнецца, а тым часам прадукты можна будзе браць па старым кніжачкам. Але што ж рабіць тым, каторыя гэтых старых кніжак ні маюць —тыя, прымерам, што служылі у арганізацыях рожных і атрымоувалі пайкі?

А тым часам у бонавам бюро народу—як селядцоу у бочцы, а парадку... э, лепш аб гэтым і нігаварыць.

Цэны на хлеб з 20-га красавіка пашлі у ніз: з 2 рубл. 40 к. спала на 1 р. 50 к.

Цэны на насенне вараунoе —шаленыя:

1 лот морквы	6 р.
» буракоу	6 р.
» салаты	8 р.

Возік дроу, які, чалавек зякінуу-бы за плечы—30— 35р. Але можна спадзевацца, што і цана на дровы спадзе; земляуласьнікі, вярнуушыяся у свае двары, пачалі сеч лес і гатовыя дровы прадаюць па 100 рубл. сажэнь. З бліжэйшых мейсц дастаука абойдзецца так сама рублеу 100, дык, трэба спадзевацца. што сажэнь будзе каштаваць рублеу каля 200 р., а не 300, як цяпер.

Курсы беларусознауства.

Панядзелак 22 красавіка.

Аркадзь Смоліч. *Географія Белрусі.*

Аўторак 23 красавіка.

Язэп Варонка. *Беларусь і яе суседзі.*

Серада 24 крас.

Язэп Ліосік. *Гісторыя Вялікаго Князьства Літоускаго.*

Пачатак лекцыі у 7 гадз. веч.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**